# ПЕДАГОГИКА

## ІНТЭРАКТЫЎНАЯ ПЛЯЦОЎКА “ЛІТАРЫНКА” Ў СУЧАСНАЙ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ

***Аленічава Н.А., Пачэпка А.В.,***
*студэнткі 3 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Васюковіч Л.С., доктар пед. навук, прафесар

*Актуальнасць тэмы* абумоўлена кардынальнымі зменамі ў сучаснай адукацыйнай прасторы, якая інтэнсіўна развіваецца. Традыцыйныя метады навучання паступова саступаюць месца інавацыйным падыходам, галоўным інструментам дыдактычных трансфармацый становяцца лічбавыя тэхналогіі. У гэтым кантэксце надзвычай важна ацэньваць і выкарыстоўваць патэнцыял спецыялізаваных інтэрнэт-рэсурсаў, здольных значна павысіць якасць адукацыйнага працэсу. Адным з перспектыўных рэсурсаў з'яўляецца інтэрактыўная пляцоўка “Літарынка”, прызначаная для падтрымкі і развіцця маўленчай дзейнасці дзяцей. Артыкул ставіць *за мэту* прааналізаваць змест, структуру і асаблівасці створанага аўтарскага сайта “Літарынка”.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для артыкула паслужылі змест, структура рубрык інтэрактыўнай пляцоўкі “Літарынка”, што забяспечваюць цэласнасць дыдактычных матэрыялаў, размешчаных на платформе. Метады даследавання: тэарэтычны аналіз лінгвістычнай, псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры, аналіз вучэбна-праграмнай дакументацыі для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Аўтарская інтэрактыўная платформа створана з улікам псіхалагічных і педагагічных асаблівасцей дзіцячага ўспрымання [1, с. 7]. Галоўная мэта сайта – дапамагчы малодшым навучэнцам засвоіць асновы граматы, развіць мысленне, памяць і ўвагу праз гульнявую форму і візуальна прывабныя матэрыялы.

Адной з ключавых асаблівасцей сайта з'яўляецца яго арыентацыя на развіццё дзіцяці праз сістэму сродкаў нагляднасці. Як вядома, выкарыстанне візуальных сродкаў у навучанні мае прыярытэтную ролю для эфектыўнага засваення інфармацыі [2, с.37]. На сайце інтэрактыўнай пляцоўкі “Літарынка” нагляднасць падчас знаёмства з літарамі алфавіта мае найважнейшае значэнне, што выяўляецца ў наступным:

– яркія, прыгожыя ілюстрацыі і анімацыя. Кожная частка матэрыялу суправаджаецца маляўнічымі выявамі, якія прыцягваюць увагу і дапамагаюць лепш зразумець тэму;

– структураванасць візуальнага кантэнту. Тэмы, сістэма пазнавальных дзеянняў падзяляюцца на невялікія, кампактныя блокі, якія максімальна рэалізуюць абраны візуальны падыход;

– выкарыстанне дыдактычных гульняў. Сайт актыўна прапануе займальныя формы навучання, дзе нагляднасць выступае неад'емнай часткай гульні [1, с. 8]. Гэта гульні на супастаўленне якасцей, уласцівасцей, пошук прадметаў, разгадванне загадак, складанне слоў з літар і г.д., усе заданні дапоўнены візуальнымі прывабнымі элементамі;

– займальныя заданні, праз якія неабходна ўзаемадзейнічаць з візуальнымі аб'ектамі, што спрыяюць актыўнаму ўдзелу дзіцяці ў працэсе навучання.

Названыя аспекты нагляднасці, рэалізаваныя на нашым рэсурсе, цалкам адпавядаюць сучасным педагагічным патрабаванням, паколькі візуальнае ўспрыманне з'яўляецца адным з асноўных каналаў атрымання інфармацыі для дзяцей малодшага ўзросту [2, с. 37–38].

Апроч рэалізаванага прынцыпу нагляднасці, інтэрактыўная пляцоўка “Літарынка” мае шэраг іншых істотных пераваг у параўнанні з іншымі інтэрнэт-рэсурсамі:

– даступнасць і зручнасць. Рэсурс даступны ў пастаянным рэжыме, у любым месцы, дзе ёсць доступ да інтэрнэту. Гэта робіць сайт ідэальным інструментам для дамашняга навучання, дадатковых, гуртковых і іншых заняткаў;

– індывідуальны падыход. Сайт дазваляе дзецям займацца ў адпаведнасці з уласным тэмпам, звяртацца да заданняў столькі разоў, колькі неабходна канкрэтнаму карыстальніку, што дае магчымасць дэталёва засвоіць матэрыял і пазбегнуць стрэсу;

– пашырэнне кругагляду. Акрамя асноўных дыдактычных функцый, сайт развівае эмацыйную сферу дзіцяці, пашырае і актывізуе яго слоўнікавы запас, фарміруе цікавасць да ведаў, актуалізуе жаданне вучыцца.

У практычным плане інтэграцыя гэтага рэсурсу ў адукацыйны працэс можа адбывацца на розных узроўнях. Для бацькоў гэта магчымасць забяспечыць рацыянальнае асяроддзе для развіцця дзіцяці ў дамашніх умовах, дапоўніць абавязковую школьную праграму цікавымі і карыснымі заняткамі. Сістэматычнасць матэрыялаў дазваляе лагічна пашыраць веды, пачынаючы з элементарных, паступова пераходзіць да больш складаных тэм. Настаўнікі як суб'екты адукацыйнага працэсу могуць выкарыстоўваць платформу як дадатковы інструмент для правядзення ўрокаў, падрыхтоўкі варыятыўных заданняў або для індывідуальнай працы з вучнямі, якія патрабуюць павышанай увагі.

Эфектыўнасць візуальнага падыходу, які з'яўляецца адной з галоўных характарыстык інтэрнэт-рэсурсу "Літарынка", асабліва значная пры засваенні абстрактных паняццяў. Дзеці малодшага ўзросту лепш разумеюць і запамінаюць інфармацыю, калі яна прадстаўлена ў нагляднай форме [2, с. 39]. Яркія ілюстрацыі, анімацыя і інтэрактыўныя элементы дазваляюць "убачыць", "пражыць" матэрыял, спрыяюць яго глыбокаму разуменню і запамінанню.

**Заключэнне.** Такім чынам, інтэрактыўная пляцоўка "Літарынка" з'яўляецца не проста папулярным рэсурсам, а запатрабаваным інструментам у сённяшняй адукацыйнай прасторы. Спецыфіка сайта, скіраваная на візуальнае ўспрыманне і інтэрактыўнае навучанне, у спалучэнні з даступнасцю і сістэматычнасцю матэрыялаў, робяць яго актуальным сродкам для развіцця маўлення дзяцей і аптымальнага засваення ведаў. Яго эфектыўнасць павялічваецца праз выкарыстанне сучасных сродкаў нагляднасці, якія адпавядаюць псіхалагічным асаблівасцям дзіцячага ўспрымання. Спалучэнне інтэрактыўнасці, прыгожага дызайну, сістэматызаванага матэрыялу, яго даступнасць робіць сайт эфектыўным інструментам, накіраваным на фарміраванне маўленчай дзейнасці навучэнцаў, у руках педагогаў, бацькоў, настаўнікаў і, вядома, саміх дзяцей, якія схільныя вучыцца ў працэсе гульні, праз гульню.

Выключная роля сайта ў фарміраванні паўнацэннай маўленчай культуры і атмасферы зацікаўленасці да спазнання беларускай мовы. Праз гульнёвы і прывабны візуальны кантэнт інтэрактыўная пляцоўка "Літарынка" здольны абудзіць у дзяцей жаданне вучыцца, даследаваць, шукаць і адкрываць нанова свет ведаў. Гэта ствараце надзейны фундамент для навучання, паколькі пазітыўнае стаўленне да адукацыі закладваецца менавіта ў раннім узросце.

1. Аленічава, Н.А. Роля нестандартных урокаў у развіцці пазнавальнай цікавасці малодшых школьнікаў / Н.А. Аленічава// Свет дзяцінства ў сучаснай адукацыйнай прасторы : зб. арт. студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў. - Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2025. – С. 7-10.

2. Кириленко, М. С. Роль наглядных средств обучения в формировании учебной деятельности младших школьников / М.С. Кириленко; науч. рук. Слепцова Л. Ю. // XVIII Машеровские чтения : материалы международной научно-практической конференции студентов, аспирантов и молодых ученых, Витебск, 25 октября 2024 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2024. – Т. 2. – С. 37-39.

3 Аленічава, Н.А. Літарынка [Электронны рэсурс] / Н.А. Аленічава, А.В. Пачэпка // Інтэрактыўная пляцоўка па вывучэнні беларускага алфавіта. – Рэжым доступу: https://azbukadzetyam.online/. – Дата звароту: 05.03.2026. – Тэкст: электронны.

## ЭФФЕКТИВНОСТЬ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ИГРОВЫХ ТЕХНОЛОГИЙ НА УРОКАХ МАТЕМАТИКИ В НАЧАЛЬНОЙ ШКОЛЕ: РЕЗУЛЬТАТЫ ЭКСПЕРИМЕНТА

***Андрейчук Е.А.,***
*студентка 4 курса БрГУ имени А.С. Пушкина, г. Брест, Республика Беларусь*
Научный руководитель – Онискевич Т.С., канд. пед. наук, доцент

В последнее десятилетие, с введением в Беларуси ЦТ и ЦЭ по математике, во время которых правилами запрещено использовать технические средства, обозначилась проблема недостаточных вычислительных навыков выпускников. Поскольку процесс формирования как устных, так и письменных вычислительных навыков учащихся начинается в начальной школе, где закладывается основа интереса к учению, приобретаются элементарные навыки «добывания» и применения знаний, то работу по совершенствованию математического образования учащихся нужно начинать уже в начальной школе. Анализ